# Акцыя “Нашы дзеці”

Акцыя “Нашы дзеці” – мабыць, адна з самых добрых і цёплых перадсвяточных акцый, якая аб'ядноўвае неабыякавых дарослых. Напярэдадні самых любімых усімі святаў – Новага года і Калядаў да дзяцей-інвалідаў і дзяцей, якія знаходзяцца ў дзіцячым сацыяльным прытулку ДУА “Сацыяльна-педагагічны цэнтр Ашмянскага раёна”, з падарункамі і віншаваннямі прыйшлі спецыялісты аддзяленняў сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна” сумесна з Ашмянскай раённай арганізацыяй грамадскага аб'яднання “Беларускае таварыства інвалідаў”, а таксама Снягуркай, якая павіншавала дзяцей са святам, падарыла навагодні настрой і ўручыла падарункі.







